# ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ, ПЕРЕВОД И ИНТЕРПРЕТАЦИЯ ТЕКСТА В МНОГОКУЛЬТУРНОМ МИРЕ

УДК 82.09

## ІДЭЙНА-ЭСТЭТЫЧНАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ВАЕННАЙ ТЭМЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ ПЕРЫЯДУ 1920 – 1930-х гг.

**Т.Р. Багарадава**
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Рэспубліка Беларусь*
*E-mail: bogoradova1974@yandex.ru*

У артыкуле разглядаюцца ідэйна-эстэтычныя дамінанты аповесці пра вайну ці ваенную сітуацыю аўтарства беларускіх пісьменнікаў, народжаных у канцы XIX – пачатку XX ст.; характарызуецца эвалюцыя выяўленчых і фармальных магчымасцей жанру аповесці пра вайну, а таксама поглядаў празаікаў на перажытае.

*Ключавыя словы:* ваенная аповесць; аўтабіяграфізм; прыгодніцкі сюжэт; інтэлектуальна-філасофскі пачатак; дакументальны наратыў.

Беларуская аповесць пра вайну ці ваенную сітуацыю бярэ свой пачатак з 1920 – 1930-х гг. Ідэйна-эстэтычныя дамінанты твораў пра вайну аўтарства старэйшых пісьменнікаў вызначаліся найперш задачамі нацыянальнага Адраджэння. На гэты перыяд прыпадаюць падзеі Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі ў Расіі, з яе ідэямі сацыяльнай роўнасці і справядлівасці, узятымі з прац К. Маркса, У. Леніна, інш. Вядучым напрамкам эпохі ў беларускай прозе застаўся рэалізм, хоць вельмі значны плён пакінула і знаёмства айчынных пісьменнікаў з ма-

дэрнісцкімі літаратурнымі плынямі, а таксама з авангарднымі, што на зыходзе 1920-х гг. паступова саступілі месца сацыялістычнаму рэалізму.

Беларуская аповесць пра вайну, створаная яе ўдзельнікамі або відавочцамі і ахвярамі, якія нарадзіліся на зыходзе XIX ст. і ў 1910-я гг., была прадстаўлена ўжо ў 1920 – 1930-х гг., прычым эстэтычна развітымі формамі. Сярод іх – аповесці з аўтабіяграфічным пачаткам. Па словах В. Локун, «у пэўнай ступені можна нават гаварыць аб аўтабіяграфізме ваеннай прозы. Перажытасць матэрыялу пісьменнікамі праявілася <…> і ў шматлікіх пазіцыях формы» [10, с. 8-9].

Асабліва высокай культурай псіхалагічнага аналізу вызначаецца згаданая вышэй аўтабіяграфічная (з рознымі формамі прысутнасці аўтара ў тэксце) проза пра вайну Максіма Гарэцкага (1893 – 1938). У сусветны кантэкст беларускую ваенную аповесць увялі найперш дакументальна-мастацкія «запіскі» М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне». Поўная назва гэтага твора – «На імперыялістычнай вайне. Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы» (1914 – 1915, 1919, 1925, 1926). Аповесць пастаўлена крытыкай і даследчыкамі А. Адамовічам [1], Д. Бугаёвым [2], І. Шаблоўскай [14] у адзін шэраг з «Севастопальскімі апавяданнямі» (1855) і «Вайной і мірам» (1863 –1869) Л. Талстога, аповесцямі і раманамі А. Цвейга, Э.-М. Рэмарка. М. Гарэцкі фактычна замацаваў айчынны жанр аповесці, сцвердзіў яго як інтэлектуальна-філасофскі, дакументальны, аўтабіяграфічны наратыў пра вайну. Яшчэ адна аповесць пісьменніка, «Ціхая плынь» (1918), адлюстравала падзеі Першай сусветнай вайны ўскосна, але таксама вельмі глыбока. Малады салдат Хомка, галоўны герой аповесці, недарэчна гіне, ставячы перад чалавецтвам зусім не рытарычнае пытанне пра каштоўнасць жыцця кожнай канкрэтнай асобы: *«За што? Шэпча ён усё цішэй і цішэй. Вострая крыўда, роспач разрывае сэрца»* [5, с. 198]. У аповесці «Дзве душы» (1919) М. Гарэцкі, выкарыстоўваючы ўласны вопыт, узнавіў падзеі Лютаўскай рэвалюцыі, Першай сусветнай вайны, панараму 1917 г. у сувязі з лёсам армейскага афіцэра Ігната Абдзіраловіча, які ў гістарычнай віхуры шукае яшчэ і нацыянальную тоеснасць. У гэтай аповесці па-наватарску паказаны бессэнсоўнасць і жорсткасць ваенных дзеянняў у дачыненні да шараговага іх удзельніка, салдата.

М. Гарэцкі, як заўважыў Э. Іофе, паказаў сябе «эрудыраваным пісьменнікам, які добра ведаў творчасць такіх волатаў літаратуры рускага, украінскага і польскага народаў, як Пушкін і Гогаль, Л. Талстой і Дастаеўскі, Шаўчэнка і Міцкевіч, глыбока разумеў іх выключную ролю ў духоўным жыцці сваёй нацыі, востра адчуваў чарго-

выя патрэбы літаратурнага развіцця беларусаў» [8, с. 30]. Творчая практыка М. Гарэцкага па сваёй мастацкай вытанчанасці супастаўляльная з вопытам А. Чэхава. Блізкая М. Гарэцкаму і ідэя «індывідуальнага сумлення», якую прапагандаваў Ф. Дастаеўскі. Герой М. Гарэцкага – Лявон Задума – асоба самавітая, якая жыве рэфлексіяй у рэаліях і мірнай, і ваеннай рэчаіснасці. С. Дубавец, разважаючы пра спецыфіку прозы пісьменніка, адзначаў, што беларускага аўтара «трэба шукаць дзесьці паміж Акутагавам і Камю» [6, с. 92], адсылаючы да праяў экзістэнцыялізму ў прозе беларускага класіка. Л. Сінькова таксама адзначыла «глыбокі водгук экзістэнцыйных матываў» [9, с. 28] у ранняй творчасці аўтара: апавяданні «Што яно?» (1913), «Ідуць усе – іду я» (1919), «Габрылевы прысады» (1917 – 1928). М. Тычына пісаў: «Вайна дапамагла ўсвядоміць <…> не толькі нацыянальна-спецыфічнае, але і ўсеагульнае, тое, што аб'ядноўвае, надае нацыянальнай дзейнасці вышэйшы сэнс» [12, с. 25]. Трансляцыя пісьменнікам агульначалавечых праблем дала магчымасць разгляду нацыянальных беларускіх пытанняў у агульнаеўрапейскім кантэксце. Напрыклад, у ГДР крытыкам Т.Н. Браран (Н. Рандаў) былі даследаваны творы пра вайну М. Гарэцкага. Па словах І. Чыгрына, у пошуках праўды аўтар, «пішучы пра вайну, якую вядуць арміі дзвюх імперый, стварыў праўдзівыя творы пра ўласны народ» [13, с. 69]. Такім чынам, М. Гарэцкі ў айчыннай літаратуры пашырыў і ўкараніў традыцыі, назапашаныя сусветнай класікай у стылёвай парадыгме рэалізму. У творчасці пісьменніка эстэтычны складнік дапоўніўся дакументальным, аўтабіяграфічным матэрыялам. Адлюстраваныя мастаком слова праблемы памкнення беларусаў да самавітасці, незалежнасці, існаванне супярэчнасцей паміж інстытутам дзяржавы і чалавекам у розных жыццёвых сітуацыях (у тым ліку ў абставінах ваеннага часу) знайшлі працяг у іншых аўтараў беларускіх аповесцей пра вайну.

Даследчык В. Жыбуль адзначаў, што «бачанне і разуменне вайны як сацыяльнай з'явы ў літаратуры пастаянна мяняецца. Такая эвалюцыя характэрная для ўсёй гісторыі еўрапейскай літаратуры ад старажытных часоў да нашых дзён» [7, с. 199]. Пры наяўнасці ў айчыннай класіцы феномену М. Гарэцкага, першая палова 1920-х гг. у ацэнках ваеннай сітуацыі ў значнай ступені характарызавалася творамі аўтараў «Маладняка». Адсылкі да ваенных падзей у апавяданнях беларускага эпіка-нацыятворцы Якуба Коласа (1882 – 1956) – «Крывавы вір», «Балаховец», інш., а таксама ранняя проза з падобнымі матывамі ў спадчыне «ўзвышаўцаў» – З. Бядулі, М. Зарэцкага, К. Крапівы, К. Чорнага, якая вылучалася больш высокай за маладнякоўскую наратыўнай культурай і глыбейшым разуменнем рэчаіснасці, пасля

ліквідацыі «Узвышша» ў 1931 г. страцілі вядучую ролю ў літаратурным працэсе свайго часу. Больш прыярытэтнай зрабілася аповесць пра вайну з *адназначна-класавай* мараллю і *прыгодніцкім* сюжэтам. На актыўнае функцыянаванне рамантыка-авантурных мастацкіх форм паўплывала найперш змена эстэтычных каштоўнасцей, арыентаваных на савецкі светапогляд з яго абавязковым «гістарычным аптымізмам», а таксама арыентацыя дзяржавы, па словах Л. Гараніна, на «стварэнне новага міфа» [3, с. 39]. Прыкладам падобных твораў і зрабілася тэрміналагічна замацаваная «маладнякоўская аповесць», якая спалучыла ідэю рэвалюцыйнага змагання з увасабленнем тыпу «новага чалавека» на фоне частковага паказу ваенных падзей. Узорамі падобных твораў зрабіліся аповесці Міхася Чарота (1896 – 1937) «Свінапас» (1924), Анатоля Вольнага (1902 – 1937), у сааўтарстве з Андрэем Александровічам (1906 – 1963) і Алесем Дударом (1904 – 1937) – «Два» (1925) і «Ваўчаняты» (1925), Янкі Нёманскага (1890 – 1937) – «Партызан» (1927).

Белетрыстычны пачатак з зададзенай абмалёўкай сітуацыі, герояў, схематычнай манерай адлюстравання рэвалюцыі і грамадзянскай вайны маюць аповесці Рыгора Мурашкі (1902 – 1944) «У іхнім доме» (1927), «Вінчэсцер» (1929), «З-пад напласту гадоў» (1930), «Узброеная нянавісць» (1935), а таксама творы Яна Скрыгана (1905 – 1992) з алегарычнай назвай «Затока ў бурах» (1928, дапрацоўваўся ў 1956 г.) і Барыса Мікуліча (1912 – 1954) «Чорная вірня» (1931). Аповесць Я. Скрыгана адлюстроўвае панарамны малюнак быцця людзей, які атрымаў працяг у наватарскім рамане Кузьмы Чорнага (1900 – 1944) «Зямля» (1928) і недапісаным па прычыне неспрыяльных палітычных умоў і атмасферы часу творы Міхася Лынькова (1899 – 1975) «На чырвоных лядах» (1934).

Працягам адлюстравання гісторыка-культурнага і палітычнага кантэксту эпохі стала юнацкая (гераіка-рэвалюцыйная) аповесць Я. Коласа «Дрыгва» (1932 – 1933). Каноны «маладнякоўскай аповесці» прывялі да ўзнаўлення ў творы белетрызаванага погляду на вайну, поруч з адлюстраваннем рэальных падзей часоў белапольскай акупацыі Беларусі ў 1919 – 1920 гг. У дачыненні да коласаўскага героя М. Тычына пісаў: «Яго [Коласа – Т.Б.] вабяць да сябе людзі з шырокім поглядам на жыццё, якія востра чуюць подых яго прастораў» [12, с. 23]. Вобраз коласаўскага дзеда Талаша паўплываў на канцэпцыю народных характараў у творах іншых беларускіх пісьменнікаў 1930-х гг. Напрыклад, Кандрат Крапіва (1896 – 1991) у драме «Партызаны» (1937) намаляваў падобны вобраз дзеда Бадыля; Міхась Лынькоў (1899 – 1975) у аповесці «Міколка-паравоз» (1937) – вобраз дзеда

Астапа, Эдуард Самуйлёнак (1907 – 1939) у рамане «Будучыня» (1938) – вобраз старога Тапурыя. Кажучы пра адметнасці паказу ваеннай рэчаіснасці ў «Дрыгве», варта адзначыць ролю наратара ў выяўленні дэмакратычнага характару народнага змагання з акупантамі, а таксама смелую іранічную інтанацыю Я. Коласа-мастака ў паказе ваенных перыпетый. Па словах І. Навуменкі, вельмі значны ўплыў Я. Коласа на літаратурнае развіццё ляжыць «у рэчышчы ідэйным, у самім падыходзе вялікага пісьменніка да жыцця, у бачанні яго і адчуванні» [11, с. 206].

У беларускай аповесці 1930-х гг. з ваеннай тэматыкай выявіўся яшчэ адзін, даволі спецыфічны, ракурс: скіраванасць на абмалёўку барацьбы Усходу і Захаду, ідэй новага грамадства і яго класавай маралі з буржуазным, «старым» светам. Такія аповесці Макара Паслядовіча (1906 – 1984) «Марсель» (1931), Э. Самуйлёнка «Тэорыя Каленбрун» (1933), Платона Галавача (1903 – 1937) «Носьбіты нянавісці» (1936) і «Яны не пройдуць» (1937) – дэкларацыйныя і накіраваныя супраць праяў таталітарызму ў чужых дзяржавах. З пералічаных аповесцей мастацкай смеласцю вылучыўся твор Э. Самуйлёнка. Па словах М. Тычыны, «аповесць Э. Самуйлёнка па жанравых прыкметах знаходзіцца на мяжы палітычнага дэтэктыва і антыўтопіі з элементамі фантастыкі» [4, с. 119]. Твор Змітрака Бядулі (1996 – 1941) «Набліжэнне» (1935) меў працяг пад назвай «У дрымучых лясах» (1939). Абедзве аповесці З. Бядулі вызначаюцца больш глыбокім адлюстраваннем рэчаіснасці падчас вайны, рэвалюцыі. Пісьменнік звяртае ўвагу на гвалт у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва ў беларускіх мястэчках.

Такім чынам, беларуская аповесць пра вайну ці ваенную сітуацыю запачаткавана перыядам 1920 – 1930-х гг. Нягледзячы на тое, што пэўныя творы з улікам часавай прыналежнасці маюць элементы дэкларатыўнасці, адзначаны жанр увасоблены ў развітых фармальна-эстэтычных варыянтах: здабытках інтэлектуальна-філасофскага, дакументальнага, аўтабіяграфічнага наратыву, прыгодніцкіх формах маладнякоўскага перыяду, белетрыстыцы.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю / А. Адамовіч. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1980. – 225 с.

2. Бугаёў, Д. Я. Максім Гарэцкі / Д. Я. Бугаёў. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 237 с.

3. Гаранин, Л. Я. Философские искания в белорусской литературе / Л. Я. Гаранин. – Минк : Наука и техника, 1984. – 221 с.

4. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі,

Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1999–2015. – Т. 2 : 1921–1941. – 2002. – 903 с.
5. Горецкий, М. Избранное / М. Горецкий. – Минск : Художественная литература, 1989. – 544 с.
6. Дубовец, С. Максим Горецкий: неюбилейное слово / С. Дубовец // Неман. – 1993. – № 2. – С. 92.
7. Жибуль, В. Белорусская проза о войне и классическая традиция / В. Жибуль. – Минск : Наука и техника, 1986. – 151 с.
8. Іофе, Э. Р. Максім Гарэцкі – беларусазнаўца / Э. Р. Іофе // Роднае слова. – 2013. – № 2. – С. 30.
9. Корань, Л. Цукровы пеўнік : Літ.-крытыч. арт. / Л. Корань. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 286 с.
10. Локун, В. І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гг. / В. І. Локун. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.
11. Навуменка, І. Якуб Колас : нарыс жыцця і творчасці / І. Навуменка. –2-е выд. – Мінск : Народная асвета, 2003. – 207 с.
12. Тычына, М. Час прозы : літаратурна-крытычныя артыкулы / М. Тычына. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – 206 с.
13. Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 167 с.
14. Шаблоўская, І. Паэтыка славянскай ваеннай прозы / І. Шаблоўская. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 24 с.

## IDEAL AND AESTHETIC IMPLEMENTATION OF THE MILITARY THEME IN THE BELARUSIAN STORY OF THE PERIOD 1920 – 1930s

**T.R. Baharadava**
*Polotsk State University,*
*Republic of Belarus*
*E-mail: bogoradova1974@yandex.ru*

The article examines the ideological and aesthetic dominants of a story about a war or a military situation by Belarusian writers born in the late 19th - early 20th centuries; characterized by the evolution of the visual and formal possibilities of the genre of the story of the war, as well as the views of prose writers on the past.

*Keywords:* war story; autobiography; adventure plot; intellectual and philosophical beginning; documentary narrative.